# * Абагульненне па тэме «Беларусь і цывілізацыі свету ў перыяд ранняга Новага часу»

## Працуем з паняццямі

**1.** А. Разгледзьце прапанаваны пералік паняццяў і ўключыце ў табліцу тыя, з дапамогай якіх можна ахарактарызаваць розныя бакі развіцця тэрыторыі Беларусі ў перыяд ранняга Новага часу.

*Абсалютызм, Адраджэнне, Асветніцтва, барока, буржуазная рэвалюцыя, валока, Генрыхавы артыкулы, дысідэнт, імперыя, каланіялізм, капіталізм, класіцызм, Контррэфармацыя, «ліберум вета», магнацкае прадпрымальніцтва, мануфактура, Пакта канвента, паланізацыя, прамысловая рэвалюцыя, пратэкцыянізм, пратэстантызм, прыгоннае права, рэлігійная вайна, Рэфармацыя, самаізаляцыя, сарматызм, сойм, Статут, фальварак, фальварачна-паншчынная сістэма, царкоўная унія, цэх, шляхецкая рэспубліка, Эдукацыйная камісія.*

| Палітычнае развіццё | Эканамічнае развіццё | Духоўнае развіццё |
|---|---|---|
| | | |

Б. Ахарактарызуйце палітычнае, эканамічнае і духоўнае развіццё тэрыторыі Беларусі (на выбар) у перыяд ранняга Новага часу, выкарыстаўшы паняцці з табліцы.

## Чытаем і пераўтвараем розныя віды тэкстаў

**2.** Разгледзьце картасхему, уважліва прачытайце вытрымку з польскай хронікі, выканайце прапанаваныя заданні.




*«Яны ўсталі. І нават сярод нас, палякаў, мала хто не плакаў або не быў да глыбіні душы крануты жалем, бо многія з паноў-рады заліваліся слязьмі. 1 ліпеня падаўлены А. Валовіч дрыготкім голасам чытаў тэкст прысягі, а іншыя, захлынаючыся плачам, паўтаралі яго за ім».*

А. Дайце назву картасхеме, указаўшы храналагічны перыяд, які яна характарызуе. Свой адказ абгрунтуйце.

Б. Якая падзея аб'ядноўвае прадстаўленую картасхему і ўрывак з польскай хронікі? Калі яна адбылася? Што выклікала такія пачуцці паноў-рады?

В. Ахарактарызуйце названую вамі ў папярэднім заданні падзею паводле наступнага плана.

| Год, назва | Прычыны | Умовы | Вынікі |
|---|---|---|---|
| | | | |

Г. Якія наступствы для Усходняй Еўропы, у тым ліку для ВКЛ, мела гэтая падзея?

**3.** Разгледзьце карціну Я. Норбліна «Соймік перад касцёлам» і адкажыце на пытанні.



А. З якімі мэтамі сабраліся людзі перад касцёлам? Прадстаўнікамі якіх саслоўяў яны з'яўляліся?

Б. Правядзіце мультысэнсорны аналіз ілюстрацыі, закончыўшы наступныя сказы: Гледзячы на карціну,

- я бачу…
- я чую…
- я пытаю сябе…
- я спадзяюся / апасаюся…
- я думаю, пасля адбудзецца…

В. Соймік не мог працягвацца больш за чатыры дні, а ўсе яго ўдзельнікі мусілі з'явіцца ў першы дзень склікання. Тыя, хто не з'явіўся, павінны былі падпарадкоўвацца рашэнням, прынятым без іх удзелу. Адным з найбольш людных быў соймік у Бярэсці 1764 г., што налічваў 1250–1450 чалавек. Самымі малалікімі соймікамі былі Аршанскі 1628 г. і Старадубскі 1666 г., якія сабралі па сем удзельнікаў.

Якім чынам адбывалася абмеркаванне і прыняцце рашэнняў на сойміках? Якія вартасці і недахопы мела такая форма правядзення сходаў з улікам таго, наколькі магла адрозніваца колькасць удзельнікаў? Чаму адны соймікі працягваліся некалькі гадзін, а іншыя — усе чатыры дні?

Г. Якую ролю ў сістэме дзяржаўнага кіравання займалі такія сходы? Растлумачце, якім чынам яны ўплывалі на вырашэнне найважнейшых дзяржаўных пытанняў.

Д. Вызначце, узмацнялася ці аслаблялася роля павятовых соймікаў на працягу XVII–XVIII стст. з улікам унутры- і знешнепалітычнага развіцця Рэчы Паспалітай. Свой адказ аргументуйце.

## Аналізуем, тлумачым, разважаем

**4.** Знайдзіце лішні элемент. Вызначце, што аб'ядноўвае астатнія.

1) «Катэхізіс», «Апостал», «Малая падарожная кніжка», «Псалтыр».

2) Дэулінскае перамір'е, Андрусаўскае перамір'е, Альтмаркскае перамір'е, Палянаўскі мір.

3) Ілья Капіевіч, Казімір Семяновіч, Мікола Гусоўскі, Марцін Пачобут-Адляніцкі.

4) Кальвінізм, англіканства, лютэранства, антытрынітарызм.

5) 1557 г., 1569 г., 1764–1766 гг., 1765 г.

6) Бітва пад Галоўчынам, бітва пад Кірхгольмам, бітва пад Лясной, Палтаўская бітва.

7) Манарх, заканадаўства, сойм, знешняя палітыка.

8) Жыгімонт II Аўгуст, Стэфан Баторый, Жыгімонт III Ваза, Станіслаў Аўгуст Панятоўскі.

**5.** Дакажыце або абвергніце наступныя тэзісы.

А. Аграрная рэформа сярэдзіны XVI ст. была выклікана як унутранымі, так і знешнімі прычынамі.

Б. Унутрыпалітычныя падзеі ў Рэчы Паспалітай XVII ст. паспрыялі эканамічнаму ўздыму беларускіх зямель.

В. Мануфактуры зрабіліся пануючай формай арганізацыі вытворчасці на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVIII ст.

Г. Большая частка ўніятаў на тэрыторыі Беларусі — прадстаўнікі сялянскага саслоўя.

Д. Цэнтрамі развіцця культуры на тэрыторыі Беларусі ў XVII–XVIII стст. выступалі каралеўскія ўладанні.

**6.** Знайдзіце ўзаемасувязь у прапанаваных ланцужках.

А. Каланіяльныя захопы — фарміраванне імперый Новага часу — усталяванне абсалютных манархій.

Б. Рэфармацыя — рэлігійныя войны ў Еўропе — Вестфальская сістэма міжнародных адносін.

В. Лівонская вайна — утварэнне Рэчы Паспалітай — паланізацыя беларускіх зямель.

Г. Першапачатковае назапашванне капіталу — развіццё мануфактурнай вытворчасці — развіццё рэгіянальнага і міжнароднага гандлю — прамысловы пераварот.

**7.** А. Назавіце краіну (-ы), звязаную (-ыя) са згаданай гістарычнай падзеяй або працэсам эпохі Новага часу. Растлумачце, чаму менавіта ў гэтай краіне (-ах) яны адбыліся:

→ пачатак эпохі Адраджэння;
→ «шляхецкая рэспубліка»;
→ палітыка самаізаляцыі;
→ агароджванні;
→ «асветны абсалютызм»;
→ Вайна за незалежнасць.

Б. Паразважайце, як гэтыя падзеі і працэсы, што пачаліся / адбываліся ў асобных краінах, паўплывалі на гістарычнае развіццё іншых краін і народаў.

## Параўноўваем

**8.** Напачатку Новага часу на тэрыторыі Заходняй Еўропы прыгоннае права практычна адсутнічала. У Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, наадварот, запрыгоньванне сялян узмацнялася, а прыгонніцтва на доўгі час засталося найважнейшым элементам сацыяльных адносін у сельскай гаспадарцы.

А. Чым можна растлумачыць гэтыя працэсы?

Б. Параўнайце этапы запрыгоньвання сялян на беларускіх землях і ў Расійскай дзяржаве. Зрабіце вывад.

| Этапы запрыгоньвання сялян на тэрыторыі Беларусі | | Этапы запрыгоньвання сялян у Расійскай дзяржаве | |
|---|---|---|---|
| **1447 г.** Прывілей Казіміра | Даваў права феадалам чыніць суд над залежнымі сялянамі; забараняў феадалам прымаць збеглых | **1497 г.** Судзебнік Івана III (указ аб Юр'евым дні) | Абмежаваў пераход сялян двума тыднямі года (на Юр'еў дзень) з выплатай «пажылога» |
| **1468 г.** Судзебнік Казіміра | Уводзіў пакаранне за дапамогу збеглым сялянам | **1550 г.** Судзебнік Івана IV | Пацвердзіў рашэнні 1497 г. пра Юр'еў дзень, павялічыў «пажылое» |
| **1529 г.** I Статут ВКЛ | Уводзіў «земскую даўніну»: «пахожы» селянін, пражыўшы на зямлі феадала больш за 10 гадоў, рабіўся «непахожым» | **1581 г.** Указ Івана IV аб «запаветных летах» | Забараніў пераход сялян на Юр'еў дзень |
| **1557 г.** «Устава на валокі» | Замацоўвала сялян за валокамі | **1597 г.** Указ аб «урочных летах» | Уводзіў 5-гадовы тэрмін вышуку збеглых сялян |
| **1566 г.** II Статут ВКЛ | Пацвярджаў «земскую даўніну»; уводзіў 10-гадовы тэрмін вышуку збеглых сялян | **1607 г.** Указ Васіля Шуйскага аб вышуку збеглых | Уводзіў 15-гадовы тэрмін вышуку збеглых сялян |
| **1588 г.** III Статут ВКЛ | Уводзіў 20-гадовы тэрмін вышуку збеглых сялян | **1649 г.** Саборнае ўлажэнне | Скасаванне «ўрочных летаў». Бестэрміновы вышук сялян і іх вяртанне |

## Сістэматызуем веды

**9.** Пералічыце перадавыя ідэі і дасягненні Новага часу. Як яны змянілі жыццё грамадства? Вынікамі якіх з іх мы карыстаемся сёння?

**10.** Якімі падзеямі / з'явамі / працэсамі вы б дапоўнілі стужку часу з пачатку гэтага раздзела? Прапануйце форму для іх абазначэння (карта, карціна, фотаздымак, цытата, фрагмент крыніцы, дата і інш.).